*Шылай, В.У.* Насельнікі замагільнага свету і рэчаісны свет паводле «Плавання св. Брэндана» / В.У. Шылай // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. — Мн.: БДУ, 2005. — С. 151–154.

***В. У. Шылай***

# НАСЕЛЬНІКІ ЗАМАГІЛЬНАГА СВЕТУ І РЭЧАІСНЫ СВЕТ ПАВОДЛЕ «ПЛАВАННЯ св. БРЭНДАНА»

Святы Брэндан Кланферцкі (каля 484/486—578, памяць адзначаецца 16 мая) быў адным з найбольш актыўных дзеячаў кельцкай (іра-шатландскай) царквы. Пра жыццё яго вядома няшмат. Нарадзіўся Брэндан на тэрыторыі сучаснага ірландскага графства Кэры, першапачаткова яго выхоўвала абатыса св. Іта, потым ён вучыўся ў абата св. Ярлата. Пасля таго, як сам стаў манахам і святаром, праводзіў актыўную дзейнасць, накіраваную на заснаванне новых кляштараў у Ірландыі і Шатландыі. Па назве аднаго з заснаваных кляштараў атрымаў сваю мянушку. Лічыцца дакладна ўсталяваным падарожжа Брэндана на Аркнейекія, Шэтландскія і Гебрыдскія астравы. Магчыма, ён таксама наведаў Уэльс і Брэтань.

З пачатку VIII ст. з імем Брэндана звязваецца марское падарожжа на захад (Navigatio Brendani) з мэтай адшукання «абіцянай зямлі святых». Крыніца была перакладзена на лацінскую мову прынамсі ў першай палове X ст. На лацінскай мове размешчана ў Інтэрнеце (рэсурс Biblioteca Augustana), пераклад крыніцы на рускую мову (аўтар М. Гарэлаў) быў надрукаваны выдавецтвам «Азбука-класіка» ў 2002 г.

«Плаванне св. Брэндана» ў асноўным прыцягвала да сябе ўвагу даследчыкаў, што былі звязаны з гісторыяй мараплаўства. Крыніца мае дакладныя апісанні лёгкіх марскіх кельцкіх лодак, а таксама шэраг геаграфічных намёкаў, што дазваляюць выказаць меркаванне



пра тое, што Брэндан дасягнуў Азорскіх (або Канарскіх) астравоў, або нават і ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі. Прынцыповая магчымасць плавання на далёкія дыстанцыі з выкарыстаннем абмежаванага арсенала тэхнічных сродкаў была даведзена на практыцы Цімам Северынам, які на скураной лодцы (драўляная аснова, абцягнутая шкурамі быкоў, абмазаная тлушчам і пафарбаваная ў чырвоны колер) прайшоў морам ад Ірландыі да Ньюфаўндленда.

Легендарнае плаванне св. Брэндана прадаўжалася сем год. За гэты час святы разам са сваімі вучнямі наведаў каля дзесятка астравоў (некаторыя па некалькі разоў). Адлегласць паміж астравамі вызначаецца ў днях шляху. Асобныя астравы выконваюць каляндарную функцыю — тыя, куды Брэндан прыбывае некалькі разоў, каб адзначыць Вялікдзень або Каляды.

У самым агульным плане астравы можна размеркаваць па чатырох групах.

Першую з іх складаюць астравы, для апісання якіх выкарыстоўваліся казачныя (ці нават міфічныя) сюжэты. Найболып яскравы прыклад такога кшталту дае востраў, што ўяўляў сабой спіну велізарнай рыбы Ясконція (самага вялікага стварэння ў свеце).

Другую групу складаюць астравы, на якіх былі размешчаны кляштары кельцкай царквы. З іх апісанняў можна атрымаць дастаткова дакладную інфармацыю па

пытаннях, звязаных з арганізацыяй бытавога і царкоўнага жыцця кельцкіх кляштараў, у тым ліку па некаторых дагматычных праблемах.

Трэцюю групу рэпрэзентуе адзіны востраў, апісаны ў раздзелах 28—30. Востраў мае выгляд калоны вышынёй да неба і даўжынёй у адну мілю з самага чыстага крышталя (columna vero erat de cristallo clarissima). Апошняя характарыстыка дазваляе выказаць меркаванне, што Брэндан і яго спадарожнікі сустрэлі айсберг. Але той факт, што тут у спецыяльнай нішы былі знойдзены чаша (conopei) і кубак (patenam), можа ўказваць на нейкі асаблівы характар гэтага вострава.

Чацвёртую групу складаюць астравы, што маюць сувязь з патойбаковым светам. Менавіта яны і будуць разгледжаны ў гэтым паведамленні.

Першым сярод астравоў чацвёртай групы з'яўляецца востраў пад назвай «Птушыны рай», апісаны ў раздзеле 12 помніка. Тут было шмат зелені, лес, кветкі. У цэнтры вострава знаходзілася крыніца, над якой расло велізарнае дрэва. Вада мела снатворныя якасці, кожны, хто яе папіў, засыпаў на 24 гадзіны. На галінах сядзелі белыя птушкі — адпалыя ад бога анёлы, якія аднак не



мелі граху. Яны былі нізвергнуты адразу пасля свайго стварэння. У выніку іх пастаянным месцам знаходжання быў рэчаісны свет. Але, паколькі анёлы не мелі граху, яны маглі бачыць бога і таму ў святыя дні і па нядзелях прымалі на гэтым востраве цялесны выгляд птушак.

Востраў, што з'уляецца пеклам, апісаны ў раздзеле 32. Тут у сярэдзіне гары быццам кавалак свінцу плавіцца Іуда. Тут жа пакутуюць Пілат, Ана, Каіафа і сам Левіафан са світай (Leviathan cum suis satellibus). У апошнім выпадку на ўвазе маецца не тая рыба, што вядома па Талмуду, а Сатана-Люцыфер.

Гэты ж раздзел апісвае ўломак скалы, на якім знаходзіць сабе часовы адпачынак Іуда — кожную нядзелю «ад вечара да вечара» (г. зн. літургічныя суткі), ад Каляд да Адвента (Богаяўлення), ад Вялікадня да Пяцідзесятніцы і ад Ачышчэння (purification Dei) да Узыходжання. Атрымлівае ён дадзены адпачынак толькі па літасці Ісуса Хрыста. Увесь астатні час Іуда знаходзіцца ў нетрах вулкана, на востраве, які падарожнікі пакінулі за спінамі.

«Зямля абяцаная», якую Брэндан пабачыў на восьмым гаду свайго падарожжа, вельмі сцісла апісваецца ў раздзелах 36—37. Паведамляецца, што яна ўяўляе сабой шырокую раўніну, поўную дрэў з пладамі. Тут ніколі не бывае ночы. Карціна не з'яўляецца поўнай і завершанай. Па сярэдзіне вострава працякае рака, праз якую падарожнікам перайсці нельга. У выніку яны нават не ведаюць, якую частку займае раўніна адносна вострава цалкам — больпую ці меншую.

Такім чынам, аналіз «Плавання св. Брэндана» дазваляе прапанаваць наступныя высновы:

- тэкст помніка рэпрэзентуе сабой традыцыю марскога падарожжа ў замагільны свет, пачатак якой можа быць знойдзены ў падарожжы Адысея ў Аід; ірландская спецыфіка выяўляецца ў апісанні асобных сектараў як ізаляваных астравоў;
- шлях вандроўніка ўяўляе сабой шлях ад аднаго локуса да іншага, што структурна супадае са шляхам візіянера падчас бачання; як і візіянер, Брэндан памірае ў хуткім часе пасля свайго вяртання з плавання;
- як і ў бачаннях ранняга сярэднявечча рай закрыты для наведвання, у адрозненне ад пекла;

- асобныя насельнікі замагільнага свету маюць выхад у свет рэчаісны; пры гэтым яны паляпшаюць сваё становішча (адпалыя анёлы бачаць бога, Іуда адпачывае ад пакут); час пранікнення



згаданых насельнікаў дакладна вызначаны (нядзеля і перыяды святаў);
- у выніку свет замагільны ўшчыльную набліжаецца да свету рэчаіснага і ўзнікаюць зоны ўзаемнага пранікнення — у пекла зышоў грэшны спадарожнік Брэндана, хаця яго яшчэ не асудзілі і не пахавалі, у кляштары паслядоўнікаў Албея свечкі запальваюцца стралой нецялеснага агню і не згараюць.